рья. В этот период он разработал комбинированный способ переработки торфа и фосфорита на спирт, дрожжи и преципитат [8]. Предложенная им схема переработки торфа не утратила своего значения и сейчас. Это же относится и к получению ряда ценных веществ из белорусского живичного скипидара [9].

Есть основания предполагать, что многие научные работы Э.В. Змачинского, особенно теоретического плана, остались в рукописях, не были завершены и опубликованы. Не сохранился его личный архив. Постановлением особого совещания при НКВД СССР от 17 сентября 1939 г. Э.В. Змачинский был осужден по обвинению в шпионско-диверсионной деятельности сроком на пять лет. Заключение отбывал в лагере-колонии (станция Решоты Нижне-Ингашского района Красноярского края), однако после истечения указанного в приговоре срока освобожден не был. Умер 15 марта 1945 г. после тяжелого заболевания и дистрофии в больнице лагеря-колонии.

Дело по обвинению профессора Э.В. Змачинского было пересмотрено Военным трибуналом Приволжского военного округа 24 мая 1957 г. Он был реабилитирован посмертно. В положительном решении вопроса о реабилитации важную роль сыграли данные допросов академика АН БССР, профессора Н.Ф. Ермоленко и ассистента Л.И. Малишевской, на протяжении многих лет работавших на кафедре неорганической химии БГУ вместе с Э.В. Змачинским.

Есть все основания утверждать, что у истоков профессиональной университетской подготовки химиков для Беларуси стоял высокообразованный, одаренный, неординарный ученый, научные взгляды которого не утратили актуальности до настоящего времени.

1. Змачинский Э.В. // J. Chem. Education. 1937. Vol. 14. P. 232.
2. Морковко И.П., Змачинский Э.В. // Докл. АН СССР. 1937. Т. 17. № 4. С. 209
3. Змачинский Э.В. // Там же. 1937. Т. 17. № 8. С. 411.
4. Змачинский Э.В., Малишевская Л.И. // Журн. общ. химии. 1937. Т. 7. Вып. 22 С. 2693.
5. Они же // Докл. АН СССР. Т. 17. № 7. С. 361.
6. Змачинский Э.В., Крупина Л.В. // Журн. прикл. химии. 1932. Т. 5. № 5. С. 648.
7. Змачинский Э.В. // Ихтиол и сланцы. Саратов, 1920.
8. Змачинский Э.В., Шмуйлович С.Г. // Журн. прикл. химии. 1936. Т. 9. № 10 С. 1874.
9. Змачинский Э.В., Марон С.А., Шмуйлович С.Г. // Там же. 1937. Т. 10 № 12. С. 6.

Поступила в редакцию 18.05.2001.

*УДК 541*

*А.А. ЯНОУСКІ, А.Г. ЗЕЛЬСКІ*

## РЭКТАР УЛАДЗІМІР СЦЯПАНАВІЧ БАБРАУНІЦКІ



***Яноускі Алег Антонавіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прарэктар па вучэбнай рабоце, загадчык кафедры гісторыі Расіі. Галіна навуковых інтарэсаў – гісторыя міжнародных адносін XV–XVII ст., гісторыя універсітэцкай адукацыі.

***Зельскі Артур Гарыевіч*** – кандыдат гістарычных навук, загадчык Музея гісторыі БДУ.

Life and a scientific activity of Vladimir Stepanovitch Bobrovnitzki, rector of the Belarusian State University is presented on the base of archive materials.





This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

*«Беларускаму дзяржаунаму універсітэту прадстаіць ганаровая задача – і надалей выхоуваць высокакваліфікаваныя кадры»*

У.С. Бабрауніцкі

У нечым падобны лес гэтых людзей – першых рэктарау універсітэта. Усе яны, за выключэннем У.І. Пічэты, нарадзіліся на беларускай зямлі, прайшлі цяжкі шлях да сваей грамадзянскай і працоунай сталасці, каб у выніку апынуцца за кратамі. Зразумела, гэта былі розныя асобы з рознымі характарамі: адны – больш навукоуцы, другія – больш адміністратары, трэція – здолелі шчасліва спалучыць і творчасць навукоуца, і талент арганізатара. Да апошніх, на нашу думку, можна аднесці і У.С. Бабрауніцкага.

Нарадзіуся Уладзімір Сцяпанавіч Бабрауніцкі у 1905 г. у мястэчку Койданава (сучасны Дзяржынск). Акрамя яго, у сям'і было тры браты і дзве сястры. Гаспадарка бацькі была сярэдняй – тыпавой для Беларусі тых часоу: 5 дзесяцін зямлі (прыблізна 5,5 га). Акрамя таго, трымалі швальню*, у якой працавалі майстры [1]. Пэуна, бацькі разумелі неабходнасць адукацыі – усе дзеці вучыліся у школе. Уладзімір, скончыушы у 1923 г. сямігодку, вырашыу працягваць вучобу далей. У Мінску ён атрымау сярэднюю адукацыю, а затым скіравауся у Беларускі інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. У інстытуце ужо ішла рэарганізацыя – неузабаве ён быу далучаны да Горы-Горыцкага сельскагаспадарчага інстытута, і у 1925 г. была створана Беларуская дзяржауная акадэмія сельскай гаспадаркі [2]. У тым жа годзе Уладзімір паступіу вучыцца на лясны факультэт акадэміі. Разам з ім вучыліся Алесь Вечар – будучы беларускі біяхімік і паэт, Мікалай Дарожкін – будучы вядомы міколаг і фітапатолаг. У акадэміі выкладалі беларускую мову і літаратуру Максім Гарэцкі і Юрый Гаурук, глебазнауства – прафесар Я.М. Афанасьеу, фізіялогію раслін – М.М. Ганчарык [3]. Вытворчая практыка на вёсцы пераканала Уладзіміра Бабрауніцкага у тым, што "хутарская сельская вытворчасць больш ёмкая, што на хутарскай гаспадарцы лепш усталяваны севазварот, што на Беларусі, з яе глебавымі і кліматычнымі умовамі, добра можа развівацца толькі хутарская гаспадарка [4]", аб чым ён зрабіу даклад.

І калі падобныя погляды у 1926 г. супадалі з лініяй Наркамзема Беларусі на чале з Дз. Прышчэпавым, то вельмі хутка яны пойдуць у разрэз з устаноукамі кампартыі на калектывізацыю вёскі.

У 1929 г. Уладзімір Бабрауніцкі завяршыу вучобу і атрымау дыплом інжынера-лесагаспадарніка [5]. У верасні таго ж года ён быу залічаны у аспірантуру па кафедры хімічнай тэхналогіі Гомельскага лесатэхнічнага інстытута. Аспірантуру Уладзімір Бабрауніцкі скончыу датэрмінова, але без абароны дысертацыі, пасля чаго пачау працаваць асістэнтам кафедры хіміі таго ж інстытута [6].

У гэты час у інстытуце (як, дарэчы, і ва усіх іншых ВНУ) уводзіуся брыгадна-лабараторны метад. Аб заганах гэтага метаду у адносінах да вывучэння розных дысцыплін, асабліва гуманітарных, сказана шмат. Аднак, што датычыцца дакладных навук, у практычных умовах таго часу такі метад, напэуна, меу рацыю. Ва усякім разе, змена вызначанай формы заняткау была не у кампетэнцыі выкладчыка У.С. Бабрауніцкага (што пасля было інкрымінавана яму НКУС у якасці абвінавачвання). У 1932 г. ён стау дацэнтам. У сувязі з тым, што хімічнае аддзяленне у інстытуце тады зачынілі, Уладзімір Сцяпанавіч некаторы час працавау намеснікам дырэктара інстытута па вучэбнай частцы. Пасля, па парадзе сяброу, і, пэуна, адчуваючы неабходнасць працягваць вучобу, У.С. Бабрауніцкі у жніуні 1934 г. пераехау у Мінск і зноу паступіу у аспірантуру – на гэты раз Акадэміі навук БССР. Вынікам вучобы стала паспяховая абарона у красавіку 1936 г. кандыдацкай

* Швальня (уст.) – кравецкая майстэрня.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

дысертацыі на тэму "Каталітычная кандэнсацыя ацэтылена з хлорангідрыдамі у прысутнасці напаухлорыстай медзі".

Станоучай рэцэнзіяй на работу У.С. Бабрауніцкага адазвауся вядомы хімік акадэмік М.Дз. Зялінскі [7]. Тут неабходна адзначыць, што з 29 чалавек, скончыушых аспірантуру у 1936 г., дысертацыі абаранілі толькі двое, у тым ліку і Уладзімір Сцяпанавіч [8]. Яшчэ падчас вучобы у аспірантуры, у верасні 1935 г., ён стау загадчыкам кафедры хіміі і чытау курс лекцый у Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школе Беларусі [9].

У сакавіку 1936 г. У.С. Бабрауніцкі быу прызначаны часова выконваючым абавязкі дырэктара аддзялення падрыхтоукі навукова-даследчых кадрау БелАН. Аднак прыём у аспірантуру АН быу спынены яшчэ у 1934 г. і на канец 1936 г. у ёй засталіся толькі 18 чалавек. У студзені 1937 г. па дакладу У.С. Бабрауніцкага Прэзідыум акадэміі прыняу рашэнне аб ліквідацыі аддзялення [10].

Пры усёй занятасці на працы Уладзімір Сцяпанавіч працягвау займацца доктарскай дысертацыяй, праводзячы вольны час у лабараторыі. Але скончыць гэту працу не паспеу. У пачатку студзеня 1938 г. яго выкпікалі у Народны Камісарыят асветы, дзе нарком У.І. Півавараў паведаміу аб рашэнні ЦК КП(б)Б і Усесаюзнага камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР аб прызначэнні яго рэктарам БДУ [11].

Чаму менавіта У.С. Бабрауніцкі быу прызначаны на высокую пасаду рэктара адзінага на той час універсітэта? Трэба думаць, што урад БССР і, у прыватнасці НКА, імкнуліся гэтым спыніць тую чахарду з кірауніцтвам універсітэта, што ішла ужо чацвёрты год: за гэты час змянілася тры рэктары і шэсць намеснікау, выконваючых абавязкі рэктара. Уладзімір Сцяпанавіч мог задаволіць кірауніцтва сваей, у пэуным сэнсе, "невядомасцю": ён да гэтага не займау высокіх пасад, як яго папярэднікі, і таму меу шанс пратрымацца на высокай пасадзе больш працяглы час.

8 студзеня 1938 г. У.С. Бабрауніцкі прыняу справы ад выконваючага абавязкі рэктара А.Н. Андрушчанкі.

У 1937/38 навучальным годзе у Беларускім дзяржауным універсітэце налічвалася пяць факультэтау: біялагічны (кафедры: заалогіі пазванковых, заалогіі беспазванковых, сістэматыкі раслін, фізіялогіі раслін, фізіялогіі жывёл), геаграфічны (кафедры: фізічнай геаграфіі, эканамічнай геаграфіі, геалогіі), гістарычны (кафедры: гісторыі СССР, новага часу, старажытнай гісторыі і сярэднявечча, сацыяльна-эканамічных навук), фізіка-матэматычны (кафедры: матэматычнага аналізу, тэорыі функцый, вышэйшай алгебры, вышэйшай геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, агульнай і эксперыментальнай фізікі, металафізікі, электрамагнітных хістанняу, тэарэтычнай механікі), хімічны (кафедры: арганічнай хіміі, неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, фізічнай хіміі). Акрамя таго, меліся тры агульнауніверсітэцкія кафедры (замежных моу, ваеннай справы, фізічнай культуры), 13 лабараторый і 10 кабінетау. Ва універсітэце навучаліся 1097 студэнтау і 24 аспіранты [12].

Аднак навучальны працэс у БДУ ішоу з вялікімі цяжкасцямі – не хапала праграм, схем, карт, запозненa складаліся расклады заняткау, па некалькі разоу мяняліся планы сесій, расклады залікау, экзаменау. І такая сітуацыя існавала на усіх факультэтах і была у асноуным абумоулена тым, што ва універсітэце катастрафічна не хапала высокакваліфікаваных навукоуцау [13]. Так, як паведамляла газета "Звязда", на фізіка-матэматычным факультэце на гэты час не аказалася ніводнага прафесара. Не лепшае становішча склалася і на іншых факультэтах. Часта курсы чыталіся непадрыхтаванымі выкладчыкамі, а некаторыя дысцыпліны не выкладаліся увогуле. Не было каму весці заняткі з аспірантамі. Нават універсітэцкія навукоуцы, магчыма, шчыра лічылі, што да гэтага становішча давялі "арудаваушыя у БДУ і Нар-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

камасветы ворагі народа" [14]. Але відавочна, што такое становішча стала вынікам рэпрэсіуных дзеянняу улад у дачыненні да калектыву БДУ.

Амаль з першых дзён новы рэктар паспрабавау палепшыць становішча з навуковымі кадрамі. Былі распачаты перамовы з выкладчыкамі шэрага навучальных устаноу Масквы і Ленінграда. Аднак тыя, хто пагаджауся на пераезд у Мінск, адразу патрабавалі кватэры, якія, на іх погляд, адпавядалі б іх кваліфікацыі. Напрыканцы студзеня У.С. Бабрауніцкі звярнууся да Старшыні СНК БССР А.Ф. Кавалёва і наркома асветы У.І. Піваварава з просьбай выдзеліць БДУ хаця б 8–10 кватэр, паведамляючы пры гэтым, што неабходна, каб ва універсітэце працавала яшчэ 12 прафесарау і 13 дацэнтау, інакш навучальны працэс апынецца пад угрозай зрыву. Аднак кватэры так і не былі выдзелены. Запрошаныя на працу у БДУ выкладчыкі альбо не прыязджалі, альбо, папрацаваушы малы час, накіроуваліся у іншыя ВНУ СССР [15].

З 1 сакавіка 1938 г. у БДУ была уведзена штатная сістэма, якая прадугледжвала трывалую працу выкладчыкау, без сумяшчальніцтва. Гэта, як і неблагія аклады, натуральна, павінна было садзейнічаць больш стабільнай сістэме выкладання. Згодна штатам, прафесар, доктар навук павінен быу атрымліваць 1100–1300 рублёу штомесяц (у залежнасці ад стажу), дацэнт, кандыдат навук – 700–800 рублёу, асістэнт – 500 рублёу. Па штату у БДУ налічвалася 6 прафесарау (8 працавалі па сумяшчальніцтву), 20 дацэнтау (і 6 – па сумяшчальніцтву), выконваючых абавязкі дацэнта – адпаведна 17 і 1, старэйшых выкладчыкау – 5 і 2, выкладчыкау – 5 і 3, асістэнтау – 11 і 4 [16].

Як бачым, штаты невялікія. Каб вырашыць кадравыя пытанні, рэктар, як, дарэчы, і яго папярэднікі, зрабіу асноуную стауку на падрыхтоуку уласных навукоуцау. Быу аб'яулены дадатковы прыём у аспірантуру: было прынята 25 чалавек [17]. Гэтыя захады праз пэуны час павінны былі даць плён.

У 1937/38 навучальным годзе у БДУ прагулы, пропускі занятка у сталі агульнай з'явай. Расла акадэмічная запазычанасць. Так, на фізмаце 82 студэнты мелі запазычанасць па 33 дысцыплінах. Толькі на 5-м курсе таго ж факультэта 14 студэнтау мелі запазычанасць па 26 асноуных дысцыплінах. Прычыны такога становішча тлумачылі, зразумела, "шкодніцкай дзейнасцю мінулага кіраунііцтва факультэта" [18]. Пропускі студэнтамі занятка у склалі у восеньскім семестры 1937 г. 17 020 гадзін, з іх без уважлівых прычын – 5838 гадзін [19]. Ганебнай з'явай былі даносы студэнтау на выкладчыкау і на сваіх аднакашнікау, якія на занятках станоуча адзываліся аб дасягненнях заходняй навукі ці сябравалі альбо былі проста знаёмы з рэпрэсіраванымі асобамі.

Пераадолець падобнае было цяжка, у той час амаль немагчыма. Аднак змагацца з пропускамі занятка у было неабходна. 23 лютага ва універсітэцкай газеце выходзіць артыкул У.С Бабрауніцкага "Аб дысцыпліне". У ім, у прыватнасці, адзначалася, што недысцыплінаванасць у БДУ ахапіла і студэнцтва, і прафесарска-выкладчыцкі састау, і адміністрацыйна-тэхнічны персанал. Так, пасля зімовых канікул ва універсітэт спазніліся на некалькі дзён 120 студэнтау (прыблізна 1/9 частка), пачаліся пропускі занятка у. Больш таго, звыклай з'явай сталі у БДУ хуліганскія учынкі з боку студэнтау: бойка у бібліятэцы, п'янства і бойка у інтэрнаце, зняважлівыя адносіны да выкладчыкау, тэхнічнага персаналу і г. д. "Пры гэтым з гутарак са студэнтамі, – піша рэктар, – ствараецца уражанне, што вельмі многія не бачаць у недысцыплінаванасці нічога дрэннага, лічаць гэта звычайнай справай". Безадказнасць назіралася не толькі сярод студэнтау: выкладчыкі нярэдка без прычын зрывалі заняткі, часта спазняліся на лекцыі. Усё гэта, адзначау У.С. Бабрауніцкі, вядзе да дэзарганізацыі вучэбнага працэсу, невыканання вучэбнага плана. Павышэнне узроуню дысцыплінаванасці і адказнасці, на думку рэктара, павінна ісці праз растлумачальную работу сярод студэнцтва з боку рэктарата, прафкома і грамадскіх арганізацый [20].



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Усё ж захады рэктара і адміністрацыі універсітэта далі пэуныя вынікі. Спецыяльная камісія засведчыла, што скарацілася колькасць пропускау у веснавым семестры да 12 847 навучальных гадзін, з іх па уважлівых прычынах – 8029, крыху вырасла паспяховасць студэнтау па усіх факультэтах: выдатных адзнак было атрымана 56,9 % супраць 54,8 % у восеньскім семестры [21].

Палітычны рэжым, аднак, дыктавау і іншыя прыярытэты у жыцці універсітэта. Ці не галоуная увага надавалася спартыуна-ваеннаму выхаванню. Аб гэтым сведчаць нумары газеты "За ленінскія кадры", у якіх "абаронная" тэматыка займала наступнае месца пасля партыйных і палітычных матэрыялау: і у перадавых артыкулах, і вершыках кшталту "Навучыу нас Варашылау", "На мяжы савецкай", у "Абаронных частушках", паведамленнях аб поспехах у абароннай рабоце [22]. А поспехі і сапрауды былі. На факультэтах праводзіліся стралковыя спаборніцтвы, а па іх выніках – міжфакультэцкія і гарадскія спаборніцтвы, на якіх каманда БДУ заняла першае месца. Выйграла каманда БДУ і гарадскія лыжныя спаборніцтвы па буксіроуцы за аутамашынай. Былі арганізаваны аутамоташкола (150 чалавек) і гурток па вывучэнню радыё (40 чалавек). На кожным факультэце былі створаны гурткі ППХА (лепшымі былі прызнаны гурткі на гістфаку і хімфаку).

Студэнты вывучалі малакаліберную вінтоуку і станкавы кулямёт "максім". У Мінскім аэраклубе з БДУ займаліся 5 чалавек, з іх найбольш вядомай у той час была студэнтка геафака М. Казлова, якая скончыла лётную школу аэраклуба і стала лётчыкам-інструктарам [23]. Спіс гэтых дасягненняу можна працягваць. І усё было б някепска, калі б не адбівалася адмоуна на галоунай сферы дзейнасці універсітэта – на вучобе і навуцы, калі б усё гэта праходзіла без палітычнай істэрыі, калі б не было імкнення ахапіць "ваенізацыяй" 100 % студэнтау і выкладчыкау і ператварыць БДУ у "крэпасць абароны". Але гэта быу той час, калі на першым месцы была "грамадская неабходнасць", а не разумны падыход да справы.

Універсітэт не мог існаваць па-за тагачаснай палітычнай атмасферай. 2–13 сакавіка 1938 г. у Маскве адбыуся адкрыты працэс так званага праватрацкісцкага блока. Супраць М.І. Бухарына, А.І. Рыкава, В.Ф. Шаранговіча і іншых была разгорнута беспрэцэдэнтная кампанія ашальмавання у газетах і па радыё. У яе былі уцягнуты калектывы прадпрыемствау і навучальных устаноу. З нагоды выкрыцця чарговых "ворагау народа" у БДУ адбыуся мітынг студэнтау, навукоуцау і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу, на якім прамоуцы клеймавалі апошнімі словамі "гнюсных агентау фашысцкіх разведак, шкоднікау, дыверсантау, забойцау". Універсітэцкая газета стракацела артыкуламі яго супрацоунікау з характэрнымі загалоукамі: "Смерць фашысцкім наймітам!", "Сцерці з твару зямлі подлых бандытау!", "Здраднікам няма літасці!", "Раздавіць гадау", "Смерць рыцарам мяча і крыві", "Калі вораг не здаецца – яго знішчаюць", "Вялікі гнеу і абурэнне" [24].

У гэтай атмасферы усеагульнай падазронасці і недаверу працаваць было цяжка. Асабліва шчыравалі на старонках універсітэцкага друку "абаронцы прауды" і "пільныя людзі", якія абвінавачвалі рэктарат і персанальна У.С. Бабрауніцкага у розных "грахах": няма крэйды, анучак, дошак на занятках – вінаваты рэктар, пераехау намеснік прарэктара у новую кватэру і адрамантавау яе, а рэктар не рэагуе – гэта зноу жа падазрона*, адвезена мэбля на кватэру рэктара – "падхалімаж і угодніцтва" з боку адміністрацыі. Як вынік – "адсутнасць бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі" [25].

Прайшлі першамайскія святы: са студэнцкай калонай пад партрэтамі Леніна і Сталіна, з урачыстым вечарам і выступленнем мастацкай самад-

* У 1920–1930-я гг. БДУ меу кватэры так званага прафесарскага фонду, якія займалі выкладчыкі і плацілі універсітэту. Рамонт гэтых кватэр ішоу за кошт БДУ. Калі выкладчык спыняу працу у БДУ, то ён вызваляу кватэру.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

зейнасці – хору, гуртка народных танцаў, джаз-аркестра, а таксама гімнастаў і баксёраў [26]. БДУ стаў рыхтавацца да выбараў у Вярхоўны Савет БССР. Студэнты і выкладчыкі былі заняты на выбарчых і агітацыйных участках, займаліся вывучэннем закону аб выбарах, наведвалі працоўныя калектывы. На агульным аб'яднаным сходзе студэнтаў, навукоўцаў і работнікаў БДУ, Медінстытута, рабочых, служачых і ІТР Дома ўрада па Кагановіцкай выбарчай акрузе быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты П.П. Савіцкі. Будучы новы рэктар універсітэта [27].

У чэрвені ў БДУ пачала работу прыёмная камісія, планавалася прыняць 300 студэнтаў. Універсітэт пасылаў сваіх прадстаўнікоў у розныя раёны Беларусі: прафесара Ц.М. Годнева – у Віцебск, прафесара У.К. Нікіфарава – у Гомель, дацэнта І.Г. Некрашэвіча – у Оршу і інш. Газета "За ленінскія кадры" змясціла артыкулы дэканаў аб сваіх факультэтах. Там жа быў надрукаваны перадавы артыкул "Права на асвету". Ён без подпісу, але па стылю належыць У.С. Бабраўніцкаму. Акрамя ўжо звычайных для таго часу фразаўштампаў аб "забітай дарэвалюцыйнай Беларусі", "барацьбе рабочых і сялян пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі Леніна – Сталіна", у артыкуле паведамлялася, што за семнаццаць гадоў існавання БДУ падрыхтаваў каля трох тысяч спецыялістаў, падкрэслівалася, што значная частка былых выхаванцаў БДУ працуе ў самім жа універсітэце, якому, па словах У.С. Бабраўніцкага, "прадстаіць ганаровая задача і надалей выхоўваць высокакваліфікаваныя кадры" [28].

Аднак самому рэктару выконваць гэту задачу ўжо не прыйшлося: 12 ліпеня 1938 г. ён быў арыштаваны ў сваім працоўным кабінеце [29]. У.С. Бабраўніцкага абвінавацілі ў тым, што ён з'яўляўся "ўдзельнікам антысавецкай нацыянал-фашысцкай арганізацыі, праводзіў шкодніцкую работу ў АН Беларусі і Белдзяржуніверсітэце" [30]. 21 ліпеня рэктар пачаў даваць паказанні. Ён прызнаваўся ў тым, што падчас вучобы ў Горыцкай СГА "зрываў" правядзенне свята "Дні леса", "агітаваў" сялян супраць калектывізацыі, быў знаёмы з М.І. Гарэцкім, А.С. Вечарам, Я.М. Афанасьевым, М.А. Дарожкіным і іншымі "нацдэмамі", а ў Гомельскім лесатэхнічным інстытуце праводзіў заняткі па брыгадна-лабараторнаму метаду [31].

Аднак на фоне маскоўскіх працэсаў усе гэтыя "злачынствы" выглядалі непераканаўча. І ў сваіх паказаннях Уладзімір Сцяпанавіч вымушаны быў (як гэта рабілася – зразумела) сазнацца і ў практычным шкодніцтве, а пасля і ў шпіянажы, і ва ўдзеле ў нацфашысцкай арганізацыі разам з наркомам У.Л. Півавäравым, і ў стварэнні нацфашысцкай арганізацыі ў БДУ і АН [32]. Аднак даваць паказанні У.С. Бабраўніцкі не скончыў і не падпісаў іх.

У верасні 1938 г. у час допыту У.С. Бабраўніцкі заявіў, што "ўдзельнікам нацфашысцкай арганізацыі ніколі не з'яўляўся". У снежні ён пацвердзіў гэтыя свае словы, дадаўшы, што і шкодніцтвам ніколі не займаўся [33]. На допытах у траўні 1939 г. ён зноў заявіў, што ніколі не быў удзельнікам нацфашысцкай арганізацыі і аб яе існаванні нічога не ведаў, усе ранейшыя прызнанні і паказанні на вочных стаўках з М.А. Дарожкіным, У.Л. Піваваравым і іншымі былі зроблены пад "фізічным і маральным уздзеяннем з боку следчых", у выніку чаго ён быў даведзены да "бессвядомага стану". У паказаннях У.С. Бабраўніцкі пісаў: "Мяне збівалі 4 сутак беспераііынна з 12 па 16 ліпеня 1938 г. без прад'яўлення ордэра на арышт (ордэр падпісаны і санкцыя дадзена 16 ліпеня)... Такое збіццё працягвалася да 20 верасня 1938 г." [34]. Гэта і прымусіла яго паклёпнічаць на сябе і іншых. Цяпер ужо яму інкрымінаваўся не ўдзел у фантастычных арганізацыях, а ліквідацыя аспірантуры ў АН і шкодніцкая дзейнасць у БДУ. Следчыя выклікалі студэнтаў, якія далі паказанні аб тым, што былы рэктар скарачаў лекцыі па дыялектычнаму матэрыялізму, не вёў барацьбу з недысцыплінаванасцю, хаваў (!) ад ЦК КП(б)Б, СНК неабходнасць пабудовы інтэрната і г. д. Гэтыя высновы



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

падмацоуваліся актам камісіі парткома ад 7 верасня 1938 г. "аб контррэвалюцыйнай дзейнасці былога рэктара Белдзяржуніверсітэта Бабрауніцкага У.С." [35].

Аднак былы рэктар адмауляу сваю віну і пратакол аб заканчэнні следства не падпісау, як і у першы раз, абвяргаючы абвінавачванні. У.С. Бабрауніцкі хадайнічау аб новых вочных стауках, але яму было адмоулена [36].

Нягледзячы на усю непераканаучасць матэрыялау, У.С. Бабрауніцкі абвінавачвауся у тым, што ён "з'яуляуся удзельнікам нацфашысцкай арганізацыі... па заданню якой праводзіу шкодніцкую работу у Белдзяржуніверсітэце і АН БССР". У заключэнні ёсць цікавы момант: у сувязі з тым, што У.С. Бабрауніцкі адмовіуся ад сваіх паказанняу, а некаторыя з тых, хто абвінавачвау яго, былі асуджаны, а неасуджаныя таксама адмовіліся ад сваіх ранейшых паказанняу, і, акрамя таго, паколькі У.С. Бабрауніцкі да арышту з'яуляуся "сакрэтным супрацоунікам" двух аператыуных аддзелау, следства прызнавала немэтазгодным слухаць справу у судзе і накіравала яе на разгляд Асобай Нарады НКУС СССР [37].

Тут справа У.С. Бабрауніцкага прыпынілася, а у студзені 1940 г. была вернута на даследаванне. За гэты час сваякі Уладзіміра Сцяпанавіча (яго бацька, жонка, брат) паспрабавалі дабіцца справядлівасці, пісапі лісты на імя Берыі, Сталіна і Калініна, у якіх выказвалі просьбу разабрацца з абвінавачваннямі супраць іх сына, мужа, брата, прасілі паспрыяць палягчэнню рэжыму яго утрымання (зіму 1938/39 г. У.С. Бабрауніцкі правёу у летняй вопратцы, у якой быу арыштаваны, а цёплыя рэчы прыняць адмовілся). Усе гэтыя лісты трапілі у Пракуратуру БССР, а затым – у матэрыялы следства [38].

Нанава дапытаныя сведкі адмовіліся ад сваіх ранейшых паказанняу, спаслаушыся на тое, што пасля арышту У.С. Бабрауніцкага в. а. рэктара БДУ М.А. Ліхтарнікау патрабавау ад іх прадставіць недахопы, якія былі на той час у БДУ, як вынік шкодніцкай дзейнасці былога рэктара. Ізноу створаная камісія прыйшла да высновы, што практычная работа былога рэктара БДУ не была скіравана на зрыу падрыхтоукі навуковых кадрау. Праверка дзейнасці У.С. Бабрауніцкага у Інстытуце хіміі АН БССР высветліла, што там ён лічыуся аспірантам і ніякіх пасад не займау [39]. Паколькі і іншыя абвінавачванні не пацвердзіліся і шкодніцкая дзейнасць не была выяулена, то 10 сакавіка 1940 г. справа была спынена, а сам Уладзімір Сцяпанавіч 16 сакавіка 1940 г. быу вызвалены [40].

Пасля вызвалення У.С. Бабрауніцкі быу адноулены на працы у БДУ. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён працавау дацэнтам кафедры арганічнай хіміі, потым у эвакуацыі – дырэктарам Мензялінскага педагагічнага вучылішча Татарскай АССР (да 26 лістапада 1943 г.). У снежні 1943 г. па распараджэнні ЦК КП(б)Б ён быу адкліканы у Маскву і скіраваны на работу у Наркамасветы БССР. Там да сакавіка 1947 г. ён працавау у якасці кансультанта-метадыста Упраулення вышэйшай школы і з'яуляуся сакратаром партыйнай арганізацыі. Адначасова ён чытау у БДУ курс лекцый па арганічнай хіміі на біяфаку, лесахіміі і арганічнага аналізу – на хімфаку [41]. За выдатную працу у галіне асветы у ліпені 1945 г. У.С. Бабрауніцкі быу узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоунага Савета БССР, а у 1946 г. – медалём "За доблесную працу у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг." Аднак работа у апараце Міністэрства асветы не дазваляла яму удзяляць дастаткова увагі факультэту і навукова-даследчай дзейнасці. За увесь папярэдні час У.С. Бабрауніцкі надрукавау пяць даследаванняу па пытаннях хіміі. Тым не менш 1 трауня 1947 г. ён быу прызначаны намеснікам дырэктара НДІ хіміі БДУ, дзе працавау да ліквідацыі інстытута у сакавіку 1950 г. [42]. У хуткім часе Уладзімір Сцяпанавіч канчаткова перайшоу на выкладчыцкую работу ва універсітэт.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Асабістае жыццё і адносіны з адміністрацыяй у У.С. Бабрауніцкага неяк не складваліся. Пачасціліся спазненні на заняткі. Дзе шукаць карані гэтых зрываў – можа у сям'і, у зламанай лесам навуковай кар'еры? Ва усякім разе ні кіраўніцтва факультэта, ні рэктарат, здаецца, не імкнуліся высвятляць прычыны. З існуючым становішчам змагаліся выключна вымовамі і строгімі вымовамі [43]. Вынікам пропускаў партыйных сходаў стаў разгляд у чэрвені 1952 г. асабістай справы У.С. Бабрауніцкага і папярэджанне аб недапушчальнасці падобных паводзін [44].

І у гэты час У.С. Бабрауніцкі працягваў работу над доктарскай дысертацыяй на тэму "Ператварэнне цярпенавых вуглевадародаў у прысутнасці бязводнага хлорыстага алюмінія". У чэрвені 1952 г. на сходзе кафедры арганічнай хіміі было разгледжана пытанне аб рэкамендацыі У.С. Бабрауніцкага у дактарантуру. Кафедра рэкамендацыі не дала – была адзначана адрывачнасць выніковых дадзеных, адсутнасць неабходнай колькасці друкаваных прац і нават літаратурнага агляду па тэме [45].

Ці пераадолеў сябе Уладзімір Сцяпанавіч? Ва усякім разе у характарыстыцы ад 29 красавіка 1954 г. адзначана, што лекцыйныя курсы і практычныя заняткі У.С. Бабрауніцкі праводзіў на належным навуковым узроўні, прымаў удзел у грамадскай працы, хаця было і дададзена, што за парушэнні працоўнай дысцыпліны ён меў спагнанні па адміністрацыйнай і партыйнай лініі [46]. Больш, аднак, працаваць яму у БДУ не прыйшлося. У ліпені 1955 г. у сувязі са скарачэннем аб'ёму педагагічнай нагрузкі на 1955/56 навучальны год ад працы ва універсітэце быў вызвалены шэраг выкладчыкаў. У іх ліку «скарацілі» і У.С. Бабрауніцкага [47].

Да верасня 1957 г. ён працуе на кафедры хіміі Беларускага лесатэхнічнага інстытута. Пасля – да 1960 г. – на кафедры хіміі Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. З мая 1960 г. займае пасаду старэйшага навуковага супрацоўніка лабараторыі пластмас Мінскага НДі будматэрыялаў Дзяржбуда СССР і адначасова працуе па сумяшчальніцтву дацэнтам кафедры прыродазнаўства Мінскага педінстытута [48].

Працуючы у НДі, У.С. Бабрауніцкі бярэ удзел як непасрэдна выканаўца і кіраўнік у шэрагу навуковых даследаванняў па комплекснай перапрацоўцы адходаў прамысловасці, у распрацоўцы новых клеячых саставаў для пластмасавых вырабаў і інш. Некаторыя з гэтых работ ён давёў да укаранення у прамысловасць і атрымаў на іх аўтарскія пасведчанні [49].

У 1965 г. У.С. Бабрауніцкі канчаткова перайшоў на працу у Мінскі педінстытут на кафедру прыродазнаўства. Пасля стварэння на яе базе кафедры хіміі неўзабаве стаў выконваць абавязкі загадчыка кафедры, а у 1967 г. узначаліў яе.

У кастрычніку 1968 г. Уладзімір Сцяпанавіч моцна захварэў, аднак у студзені 1969 г. зноў быў на працы. Памёр ён раптоўна 28 кастрычніка 1969 г. [50].

Тыя, хто калісьці ведалі Уладзіміра Сцяпанавіча і вучыліся у яго, захавалі аб ім добрую памяць як аб таленавітым вучоным і педагогу.

1. Архіў КДБ РБ. Спр. 7108-С. Арк. 170.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т. 1. С. 414; Т. 3. С. 93. (Далей – ЭГБ).
3. Там жа. Т. 2. С. 259, 494. Беларуская энцыклапедыя. Мн., 1998. Т. 6. С. 55; Т. 2. С. 126; Т. 5. С. 89, 35. (Далей – БЭ); Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 24–28.
4. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 22–23.
5. Архіў БДУ. Спр. 35/1955. Арк. 13.
6. Там жа. Арк. 14, 24. БЭ. Т. 2. С. 458.
7. Архіў БДУ. Там жа. Арк. 4, 9; Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 73.
8. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 158.
9. Архіў БДУ. Там жа. Арк. 1.
10. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 160–161.
11. Архіў БДУ. Там жа. Арк. 1, 22; Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 35, 217.
12. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 698. Арк. 24, 26.
13. Канстанцінаў Ф. Непаваротлівасць // Звязда. 1938. 6 студз.
14. Шапіра І.П., Некрашэвіч І.Г. Яшчэ раз аб універсітэце // Звязда. 1938. 17 лют.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

15. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 192, 247, 253.
16. НА РБ. Там жа. Спр. 698. Арк. 33, 37.
17. Там жа. Спр. 721. Арк. 1–3.
18. Габрыёлау. У другім паугоддзі працаваць лепш // За ленін. кадры. 1938. 21 студз.
19. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 246.
20. Бабрауніцкі У.С. Аб дысцыпліне // За ленін. кадры. 1938. 23 лют.
21. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 246.
22. За ленін. кадры. 1938. 23 лют.
23. Кавалевіч. Узмацнім абаронную работу // За ленін. кадры. 1938. 23 лют.; Кавалевіч. Моладзь авалодвае абароннай справай // Там жа. 1938. 11 крас.; Луцэвіч Ф. Студенты-мотоциклисты // Сов. Белоруссия. 1938. 29 марта; Чырв. змена. 1938. 4 чэрв.; Канстанцінау Ф. Пілот // За ленін. кадры. 1938. 8 сак.
24. За ленін. кадры. 1938. 8 сак.
25. Паулоускі Я. Рука руку мые... // За ленін. кадры. 1938. 22 сак.; Бірылка. Эканомія на гразі і пыле // Там жа. 1938. 11 крас.
26. Першамайская калона студэнтау // Чырв. змена. 1938. 21 крас.; Свята 1 Мая // За ленін. кадры. 1938. 1 трауня.
27. Вышзй якасць агітацыйнай работы // За ленін. кадры. 1938. 14 трауня; Куксо А.Г. Агітацыя на выбарчым участку // Там жа; Цярэшчанка. Вывучаем выбарчы закон // Там жа; Наш кандыдат у дэпутаты Вярхоунага Савета БССР // Там жа. 1938. 14 чэрв.
28. Права на асвету // За ленін. кадры. 1938. 14 чэрв.
29. Архіў КДБ РБ. Там жа. Арк. 2, 4, 216.
30. Там жа. Арк. 1, 9.
31. Там жа. Арк. 18–33.
32. Там жа. Арк. 36, 39, 40, 46–53.
33. Там жа. Арк. 59, 62.
34. Там жа. Арк. 63–66.
35. Там жа. Арк. 73, 94–95, 110–117, 153–154.
36. Там жа. Арк. 162, 163, 172, 175, 192.
37. Там жа. Арк. 168–169.
38. Там жа. Арк. 212, 222–236.
39. Там жа. Арк. 238–240, 246–248, 255.
40. Там жа. Арк. 258–260.
41. Архіў БДУ. Там жа. Арк. 8, 22, 10, 11, 23, 12.
42. Там жа. Арк. 3, 40, 20.
43. Там жа. Арк. 33, 34, 39, 40, 41, 42, 47, 48, 50.
44. Там жа. Арк. 36–38.
45. Там жа. Арк. 44.
46. Там жа. Арк. 59.
47. Там жа. Арк. 59.
48. Архіў БДПУ імя М. Танка. Вопіс супрацоунікау. Спр. 888. Арк. 12.
49. Там жа. Арк. 11, 23–24.
50. Там жа. Арк. 18–19, 25, 28, 32, 35.

Поступила в редакцию 10.01.2001.

*УДК 541*

*В.В. СВИРИДОВ*

## КАФЕДРЕ НЕОРГАНИЧЕСКОЙ ХИМИИ – 80 ЛЕТ



***Свиридов Вадим Васильевич*** – академик НАН Беларуси, академик Академии образования Республики Беларусь, доктор химических наук, профессор, заведующий кафедрой неорганической химии, главный научный сотрудник НИИ ФХП. Научные интересы относятся к областям химии твердого тела, синтеза ультрадисперсных неорганических веществ и тонких пленок, фотохимии неорганических систем. Автор более 450 научных статей, трех монографий, 6 учебных пособий.

The paper briefly describes the accompiishments of the Chair of Inorganic Chemistry of Belarussian State University in chemical education, scientific researches, and training of specialists according to PhD programs between 1921 and 2001.

В краткой статье можно лишь в самых общих чертах охарактеризовать деятельность кафедры неорганической химии за время ее существования. Задача облегчается тем, что, во-первых, в этом же но-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm